# На тым тыдні...

✓**19 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **прэзентацыя электроннага выдання «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…»**, прысвечанага 180-годдзю з дня нараджэння пісьменніка, публіцыста, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і сучаснай беларускай мовы Францішка Багушэвіча.

НББ падрыхтавала самае поўнае выданне (на DVD), дзе ўпершыню ў такім аб'ёме сабраны вялікі пласт матэрыялу, які прадстаўляе веліч Багушэвіча і яго творчасці. Тут можна пабачыць і пагартаць электронныя старонкі першых прыжыццёвых выданняў паэта, сярод якіх «Dudka białaruskaja» 1891 г. (арыгінал захоўваецца ў Бібліятэцы Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук) і 1896 г. (з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва), пазнаёміцца з першым выданнем вершаванага зборніка «Smyk białaruski» з фондаў НББ. Рэсурс дае магчымасць паглядзець на класіка вачыма мастакоў, пачытаць лісты і рукапісы самога паэта са збораў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.




*Фота з партала nlb.by*

✓У Арт-гасцёўні «Высокае мѣста» **20 лютага** адкрытая **выстаўка жывапісу і арт-аб'ектаў «Много букв»** Ганны Сілівончык. Праект уключае больш за 70 працаў розных перыядаў. Ключавым элементам кампазіцыі і сэнсаўтварэння з'яўляецца тэкст. Аб'яднанне вобразаў і сэнсаў на карцінах Г. Сілівончык здзіўляе метафарычнасцю і нараджае нечаканыя асацыяцыі. Мастачка актыўна працуе і з аб'ёмнымі формамі, эксперыментуе з выяўленчымі сродкамі. Пабачыць усё можна па 15 сакавіка.

✓**20 лютага** галерэя сучаснага мастацтва «Ў» сумесна з Амбасадай Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь запрасіла на **адкрыццё выстаўкі літоўскага мастака Альгіса Грышкявічуса «Паралельныя ўяўленні»**. Яна ўключае фатаграфічныя цыклы, калекцыю жывапісу і скульптурных аб'ектаў. Сам аўтар любіць казаць, што ён не фатограф, а проста з дапамогай фотаапарата стварае карціны.

**21 лютага** НББ правяла акцыю «**Мілагучнае,**